# ПРАКТЫКА-АРЫЕНТАВАНАЕ НАВУЧАННЕ ЛІНГВІСТЫЧНЫМ ДЫСЦЫПЛІНАМ ВА УВА СФЕРЫ КУЛЬТУРЫ

***Пісарэнка А.М.,*** *загадчык кафедры беларускай і замежнай філалогіі, кандыдат філалагічных навук, дацэнт*
***Шунейка В.В.,*** *старшы выкладчык кафедры беларускай і замежнай філалогіі*

Практыка-, або прафесійна арыентаванае навучанне ўсё больш прыцягвае ўвагу спецыялістаў вышэйшай школы і мае некалькі падыходаў, якія адрозніваюцца як ступенню ахопу элементаў адукацыйнага працэсу, так і функцыямі студэнтаў і выкладчыкаў.

Найбольш вузкі падыход прадугледжвае ўзаемадзеянне практыка-арыентаванага навучання з фарміраваннем прафесійнага вопыту студэнтаў пры знаходжанні іх у прафесійным асяроддзі ў час вучэбнай, вытворчай і пераддыпломнай практыкі (Ю. Ветраў, Н. Клушына).

Другі падыход (Т. Дзмітрыенка, П. Абразцоў) пры практыка-арыентаваным навучанні прадугледжвае выкарыстанне прафесійна арыентаваных тэхналогій навучання і методык мадэлявання фрагментаў будучай прафесійнай дзейнасці на аснове выкарыстання магчымасцей кантэкснага (прафесійна накіраванага) вывучэння профільных і няпрофільных дысцыплін.

Трэці, найбольш шырокі падыход, вельмі грунтоўна сфармуляваны Ф.Г. Ялалавым у дзейнасна-кампетэнтнаснай парадыгме, паводле якой практыка-арыентаваная адукацыя накіравана на набыццё, акрамя ведаў, уменняў, навыкаў, вопыту практычнай дзейнасці з мэтай дасягнення прафесійна і сацыяльна значных кампетэнтнасцей. Гэта забяспечвае “ўключэнне” студэнтаў у працу, іх актыўнасць, параўнальную з актыўнасцю выкладчыка. У гэтым выпадку матывацыя да вывучэння тэарэтычнага матэрыялу ідзе ад патрэбы ў вырашэнні практычнай задачы. Дадзеная разнавіднасць практыка-арыентаванага падыходу з'яўляецца дзейнасна-кампетэнтнасным падыходам і падаецца нам вельмі актуальным пры выкладанні лінгвістычных дысцыплін.

Многія гады вышэйшая школа была арыентавана на перадачу студэнтам ведаў, дзякуючы якім яны маглі быць паспяховымі ў навуцы, у бізнесе і на вытворчасці. У гэтым працэсе ў Савецкім Саюзе вышэйшай школе дапамагалі буйныя вытворчыя прадпрыемствы і навуковыя арганізацыі. У цяперашні час многія вышэйшыя навучальныя ўстановы, на жаль, ужо не маюць замацаваных месцаў практыкі ў адпаведнасці з профілем падрыхтоўкі. У выніку гэтага ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Беларусі назіраецца недахоп кваліфікаваных практыка-арыентаваных кадраў, здольных паспяхова распрацоўваць і ўкараняць навукаёмістыя тэхналогіі, рэалізоўваць рэальныя бізнес-працэсы. Пры гэтым тэрмін адаптацыі маладога спецыяліста на вытворчасці становіцца занадта вялікім, а работадаўца выдаткоўвае вялікія сродкі на навучанне маладога спецыяліста адразу пасля ВНУ. Гэтая сітуацыя з'яўляецца прычынай усё большай і большай супярэчнасці паміж сістэмай вышэйшай прафесійнай адукацыі і сучасным бізнесам і вытворчасцю.

Як сцвярджаюць навукоўцы, у такой сітуацыі вышэйшай школе трэба мяняць тэхналогію навучання і пераходзіць ад тэхналогій перадачы ведаў да тэхналогіі навучання з набыццём вопыту.

Новую тэхналогію прапаноўваецца распрацоўваць на аснове практыка-арыентаванага навучання, якое павінна спрыяць павышэнню матываванасці студэнта на набыццё прафесійнай кампетэнтнасці.

У адпаведнасці з магчымасцямі сучаснага грамадства вылучаюць чатыры падыходы да практыка-арыентаванага навучання:

1. Арганізацыя вучэбнай, вытворчай і пераддыпломнай практык студэнта з мэтай набыцця рэальных прафесійных кампетэнцый па профілі падрыхтоўкі.

2. Укараненне прафесійна-арыентаваных тэхналогій навучання, якія спрыяюць фарміраванню ў студэнтаў якасцей асобы, значных для будучай прафесійнай дзейнасці, а таксама ведаў, уменняў і навыкаў (вопыту), якія забяспечваюць якаснае выкананне прафесійных абавязкаў па профілі падрыхтоўкі.

3. Стварэнне ва ўніверсітэце інавацыйных форм прафесійнай занятасці студэнтаў з мэтай вырашэння імі рэальных навукова-практычных і вопытна-вытворчых работ у адпаведнасці з профілем навучання.

4. Стварэнне ўмоў для набыцця ведаў, уменняў і вопыту пры вывучэнні вучэбных дысцыплін з мэтай фарміравання ў студэнта матываванасці і усвядомленай неабходнасці набыцця прафесійнай кампетэнцыі ў працэсе ўсяго часу навучання ва ўніверсітэце.

У адрозненне ад традыцыйнай адукацыі, арыентаванай на засваенне ведаў, практыка-арыентаванае навучанне накіравана на набыццё студэнтам вопыту практычнай дзейнасці, які выступае як гатоўнасць студэнта да пэўных дзеянняў і аперацый на аснове наяўных ведаў, уменняў і навыкаў.

Практыка-арыентаванае выкладанне звязана з выкарыстаннем магчымасцяў прафесійна накіраванага вывучэння студэнтамі профільных і няпрофільных дысцыплін.

Практыка-арыентаваныя заданні выклікаюць павышаную цікавасць з боку студэнтаў, спрыяюць развіццю дапытлівасці, творчай актыўнасці. Студэнтаў прыцягвае сам працэс пошуку шляхоў вырашэння задач. Яны атрымліваюць магчымасць развіваць лагічнае і асацыятыўнае мысленне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Выкладанне філалагічных, у тым ліку лінгвістычных, дысцыплін становіцца ўсё больш актуальным на сучасным этапе развіцця грамадства, у перыяд рэарганізацыі сістэмы выкладання ў вышэйшых навучальных установах. Маўленне маладога пакалення падвяргаецца ўплыву жаргоннай мовы, у тым ліку самых розных скарачэнняў, якія не столькі эканомяць час, колькі скажаюць маўленне асобы – *тэльце* (тэлефануйце), *днюха* (дзень нараджэння) і інш.), засмечваюць лаянкавымі і аргатычнымі словамі (*цёркі* (разбіральніцтва) і інш.), словамі-паразітамі (*ну, тыпу, як бы, рэальна, па ходу* і інш.).

У выніку тэхнічных наступстваў моладзь адвучваецца чытаць, гаварыць, а значыць, думаць самастойна. Пры электроннай перапісцы выскокваюць словы, гатовыя рэплікі-штампы. Пагэтаму ў сістэме вышэйшай адукацыі павінны заставацца лінгвістычныя дысцыпліны. Калі звярнуцца да вопыту і практыкі суседніх краін, то можна ўбачыць, што ў Расіі сучасныя ўніверсітэцкія праграмы ўключаюць, незалежна ад абранага студэнтам кірунку ў навучанні (гуманітарнага, прыродазнаўчага ці тэхнічнага), прадметы, звязаныя з вывучэннем роднай мовы. Гэта перш за ўсё такая вучэбная дысцыпліна, як “Руская мова і культура маўлення”, а таксама курсы на выбар студэнта – “Стылістыка”, “Рыторыка”, “Пісьмовае маўленне”, “Дзелавое маўленне”, “Маўленчы этыкет” і інш. [1, с. 89]. “Беларуская мова (прафесійная лексіка)” – адна з дысцыплін, якая мае практыка арыентаванае навучанне: тэарэтычныя звесткі з курса беларускай мовы ілюструюцца маўленчымі адзінкамі адпаведнай галіны ведаў, прафесіі, тэрмінасістэмы. Важным момантам з’яўляецца ўключэнне раздзелаў па “Стылістыцы і культуры маўлення”, паколькі правілы пабудовы і афармлення тэкстаў тых ці іншых стыляў, жанраў у беларускай і рускай мовах аднолькавыя. Для спецыяліста сферы культуры важна ва ўмовах дзяржаўнага білінгвізму пераключацца ў маўленні з адной мовы на іншую ці хаця б гаворку субяседніка, які карыстаецца адной мовай.

Жанравая разнастайнасць навуковага стылю, веданне якой неабходна менавіта падчас навучання (найперш рэфераты, даклады, курсавыя і дыпломныя працы, тэзісы, рэзюмэ, артыкулы) і афіцыйна-справавога стылю (аб’ява, заява, даручэнне, кантракт, аўтабіяграфія, справавое пісьмо і інш.) не могуць быць разгледжаны ў дастатковым аб’ёме за невялікую колькасць гадзін, якая адведзена ў курсе “Беларуская мова (прафесійная лексіка)”, хаця адна з задач курса – навучыць складаць і весці на беларускай мове справавую дакументацыю, рыхтаваць навуковыя і публічныя выступленні і г.д.

Важным момантам павінна таксама заставацца міждысцыплінарная сувязь, а іменна сувязь лінгвістыкі з прадметамі спецыяльнымі:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў, акрамя курса “Беларуская мова (прафесійная лексіка)”, выкладаюцца іншыя лінгвістычныя курсы з улікам спецыяльнасцяў, якія набываюць студэнты. Напрыклад, навучэнцам спецыялізацыі “Менеджмент рэкламы і грамадскіх сувязей” факультэта культуралогіі і сацыякультурнай дзейнасці прапанавана ДПВ “Маўленчае ўздзеянне ў СМІ і рэкламе”, мэтай якога з’яўляецца засваенне студэнтамі прыёмаў маўленчага ўздзеяння ў рэкламе і друкаваных сродках масавай інфармацыі, эфектыўнае выкарыстанне стылістычных рэсурсаў на ўсіх моўных узроўнях пры стварэнні публіцыстычнага тэксту, паколькі веданне механізмаў, прынцыпаў і сродкаў стварэння публічных паведамленняў і крытэрыяў іх эфектыўнасці – важная ўмова поспеху студэнта як будучага прафесіянала ў сферы рэкламы і сувязей з грамадскасцю; на факультэце музычнага мастацтва чытаецца курс “Літаратурна-мастацкія вобразы ў музычным увасабленні”, дзе значная частка часу адводзіцца менавіта маўленчаму аналізу паэтычнага тэксту, паколькі беларуская песенная паэзія характарызуецца багатай спадчынай фальклорных і аўтарскіх тэкстаў. Аналізуючы верш, вызначаючы яго ідэю, а таксама маўленчыя сродкі, накіраваныя на яе раскрыццё, будучы спявак будзе дакладна ведаць, як з дапамогай мімікі, жэстаў данесці яе змест да гледачоў / слухачоў.

Таксама студэнтам спецыяльнасцяў (мастакі, менеджары-культуролагі) прапанавана ДПВ “Стылістыка і культура прафесійнага маўлення”, дзе чытаюцца агляднія лекцыі па ўсіх стылях і камунікатыўных якасцях мовы і маўлення, але найперш увага надаецца аналізу і самастойнаму напісанню тэкстаў навуковага і публіцыстычнага зместу. Студэнт, а значыць, і будучы спецыяліст сферы культуры павінен умець прэзентаваць карціны мастакоў, уласныя карціны і вырабы з розных матэрыялаў – саломы, гліны, шкла, керамікі; павінен умець пісаць рэцэнзію на спектакль, праведзенае мерапрыемства, сам павінен пісьменна скласці сцэнарый мерапрыемства, быць гатовым да інтэрв’ю.

У сувязі з гэтым і выяўляюцца адметныя прафесійна-арыентаваныя метады навучання мове і маўленню ў ВНУ сферы культуры.

Многія метады і методыкі навучання мове, у тым ліку метад камунікатыўнай тэхналогіі і метад кейсаў, дапамагаюць студэнтам развіваць творчы патэнцыял, садзейнічаюць уключэнню ў інфармацыйны пошук. Не кожны малады чалавек можа ўдзельнічаць у прэс-канферэнцыі, дыскусіі, аднак прааналізаваць сітуацыю, прыняць удзел у вучэбных дэбатах уяўляецца нам магчымым і натуральным для кожнага. Самі ж гульнявыя тэхналогіі, у межах якіх студэнтам можна прапанаваць узяць інтэрв’ю, прадэкламаваць байку, верш ці інш., праспяваць песню, выступіць у ролі канферансье або гіда-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кансультанта на выставе той ці іншай прадукцыі спрыяюць развіццю творчых і прафесійных магчымасцяў асобы.

Спецыялісты з вышэйшай адукацыяй заклікані скласці культурную эліту нацыі, уяўляючы сабой эталоны яе адукаванасці, выхаванасці і маральнасці, заклікані фарміраваць і паглыбляць культурнае асяроддзе, найважнейшае месца ў якім займае моўнае асяроддзе. Маўленне чалавека – неад’емная частка яго іміджу, знешняя праява яго ўнутранай абаяльнасці. Калі прафесійная падрыхтоўка спецыяліста накіравана на паглыбленае засваенне пэўнай сферы чалавечай дзейнасці і тым самым вылучэнне гэтай дзейнасці ў агульнай структуры дынамічнага свету, то моўная падрыхтоўка накіравана на цэласнае, інтэгральнае ўспрыняцце гэтага свету, а таксама на якаснае самавыражэнне асобы.

Такім чынам, практыка-арыентаванае навучанне лінгвістычным дысцыплінам павінна спрыяць павышэнню матываванасці студэнта на набыццё прафесійнай кампетэнтнасці. У адрозненне ад традыцыйнай адукацыі, арыентаванай на засваенне ведаў, гэты від навучання накіравана на набыццё студэнтам вопыту практычнай дзейнасці, які выступае як гатоўнасць студэнта да выканання працы па спецыяльнасці на аснове наяўных ведаў, уменняў і навыкаў.

---

1. Бушенев, Н. Лингвистическое образование – всем студентам! / Н. Бушенев // Высшее образование в России. – 2005. – № 11. – С. 89-91.

## ПРАКТИКО-ОРИЕНТИРОВАННЫЙ ПОДХОД В ПРЕПОДАВАНИИ ДИСЦИПЛИНЫ «МЕТОДИЧЕСКОЕ ОБЕСПЕЧЕНИЕ СОЦИОКУЛЬТУРНОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ»

***Самерсова Н.В.,*** *профессор кафедры педагогики социокультурной деятельности, кандидат педагогических наук, доцент*

Выделение методического обеспечения СКД в самостоятельную дисциплину носит закономерный характер и отражает как повышение значимости собственно методического обеспечения в системе социально-культурной деятельности, так и специфику данного аспекта в обучении и воспитании кадров, способных решать актуальные задачи развития сферы культуры. Недостаточная разработанность данного вопроса приводит к тому, что методическая деятельность нередко подменяется сугубо административной, инспекторская работа вменяется в обязанности методистам, что приводит к дублированию работы управленческих служб и снижает эффективность методического обеспечения [1].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ